## *ПЕДАГОГИКА*

**УДК 378.4**

# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ФАРМІРАВАННЯ АСОБАСНЫХ КАМПЕТЭНЦЫЙ БУДУЧЫХ ПЕДАГОГАЎ СРОДКАМІ АДУКАЦЫЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ МУЗЕЯ

***С.Д. ГРЫНЬКО***
***(Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы)***

*Асвятляецца праблема падрыхтоўкі высокакваліфікаваных педагагічных кадраў. У якасці аднаго са шляхоў яе вырашэння прыводзіцца выкарыстанне адукацыйнай дзейнасці музея ў прафесійнай падрыхтоўцы будучых педагогаў, што забяспечвае фарміраванне іх асобасных кампетэнцый (каштоўнасна-сэнсавых, грамадзянска-патрыятычных, культуралагічных, здароўезберагальных, асобасна-развіццёвых), якія складаюць аснову грамадзянскасці, патрыятызму, гуманістычнай накіраванасці, а таксама здольнасці да самаадукацыі і самаразвіцця, запатрабаваных у сучасным грамадстве. Выяўляюцца метадалагічныя асновы выкарыстання сродкаў музея ў выхаванні і навучанні студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей: падыходы (аксіялагічны, культуралагічны, асобасна арыентаваны, сістэмны, кампетэнтнасны) і прынцыпы іх рэалізацыі.*

***Ключавыя словы:*** *будучыя педагогі, адукацыйная дзейнасць музея, асобасныя кампетэнцыі, метадалагічныя падыходы, прынцыпы рэалізацыі.*

**Уводзіны.** Фарміраванне такіх асобасных якасцей у студэнтаў, як дабрыня і спагадлівасць, гуманнасць і міласэрнасць, а таксама актыўная жыццёвая і грамадзянская пазіцыя з'яўляецца першаступеннай задачай пры падрыхтоўцы педагагічных кадраў, якія самым непасрэдным чынам задзейнічаны ў выхаванні пакалення новай фармацыі. Аналіз сучасных псіхолага-педагагічных даследаванняў (А.І. Жук, В.Л. Жук, І.І. Казімірская і інш.) у галіне падрыхтоўкі педагагічных кадраў і адукацыйнай практыкі ў Беларусі ўказвае на наяўнасць шэрагу праблем, звязаных з узрастаннем патрабаванняў да выканання службовых абавязкаў педагогамі, абумоўленых як сацыяльнай значымасцю прафесіі, так і інфарматызацыяй адукацыйнай сферы. Называюцца наступныя недахопы ў падрыхтоўцы сучасных настаўнікаў: вузкая прафесійная накіраванасць, адсутнасць гістарычнай і культурнай сувязі з грамадствам і яго знакамітымі прадстаўнікамі, звязаная з выкладаннем прадмета, не акрэслены крытычны і крэатыўны падыходы да вырашэння праблем, недахоп камунікатыўных і творчых здольнасцей, нізкая матывацыя на дасягненне высокіх вынікаў у педагагічнай дзейнасці. Усё гэта перашкаджае маладым спецыялістам у іх рэалізацыі ў прафесіі.

Сярод айчынных і замежных тэндэнцый у падрыхтоўцы кадраў, у тым ліку і педагагічных, вылучаюцца: фарміраванне грамадзянскай пазіцыі, агульнай культуры паводзін, гуманістычных адносін і арыентацыі на агульначалавечыя каштоўнасці; развіццё індывідуальнасці, здольнасці да крытыкі і самакрытыкі, самаадукацыі, неабходныя для рэалізацыі ў прафесійнай дзейнасці ва ўмовах сучаснага соцыуму (Т. Лукас, А.К. Маркава, Л.М. Міціна і інш.). Асаблівая ўвага ў даследаваннях надаецца сацыялізацыі маладых спецыялістаў у галіне адукацыі, іх культурнай дасведчанасці ў розных сферах жыццядзейнасці, сфарміраванасці светапогляду, развіцці іх творчых здольнасцей, усяго, што характарызуе працаўніка найперш як асобу з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй.

Менавіта таму ў адукацыйнай практыцы многіх краін свету, у тым ліку ў Беларусі, рэгламентаваныя спосабы арганізацыі педагагічнага працэсу замяняюцца творчымі, развіццёвымі, накіраванымі на ўключэнне студэнта ў практычную дзейнасць. Гэтаму садзейнічае ўкараненне кампетэнтнаснага падыходу.

Шэрагам расійскіх навукоўцаў (А.Ю. Дзесятава, М.У. Кармільцава, А.М. Сартакова і інш.) зроблены падрабязны аналіз сацыяльна-асобасных і асобасных кампетэнцый, якія істотным чынам уплываюць на паспяховасць выканання прафесійнай дзейнасці, выдзелены іх складнікі і апісана структура. У гэтай групе кампетэнцый адлюстраваны інтэгральныя ўласцівасці чалавека, звязаныя з тым, як ён будуе адносіны з іншымі людзьмі, як вырашае задачы і карыстаецца інфармацыяй, і які ўзровень самарэгуляцыі яму даступны.

Аб важнасці асобаснай кампетэнцыі ў прафесійнай дзейнасці выказваецца Я.М. Ядчанка, які вызначае названую кампетэнцыю як «комплекс навыкаў успрымання, меркавання і паводзін асобы, што павінны забяспечыць яе эфектыўную інтэграцыю ў рэчаіснасць і выступаюць асновай для працэсу самавызначэння і самарэалізацыі». Вучоны выдзяляе наступныя складнікі гэтага паняцця: каштоўнасна-сэнсавыя кампетэнцыі (здольнасць выбіраць мэтавыя і сэнсавыя ўстаноўкі для сваіх дзеянняў і ўчынкаў); грамадзянска-патрыятычныя кампетэнцыі (веданне і выкананне правоў грамадзяніна, грамадзянскі абавязак, свабода і адказнасць, упэўненасць у сабе); культуралагічныя кампетэнцыі (пазнанне каштоўнасцей культуры і асноў сямейных з'яў і традыцый); здароўезберагальныя кампетэнцыі (веданне і захаванне нормаў здаровага ладу жыцця); асобасна-развіццёвыя кампетэнцыі (засваенне

спосабаў фізічнага, духоўнага і інтэлектуальнага самаразвіцця, самарэгулявання, самаўдасканалення асобаснай і прадметнай рэфлексіі)[1] [1, с. 37–39].

У стандартах 2013 г. па педагагічных спецыяльнасцях ў пералік сацыяльна-асобасных кампетэнцый уваходзяць наступныя: валодаць якасцямі грамадзянскасці; быць здольным да сацыяльных кантактаў; валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый; валодаць навыкамі захавання здароўя; быць здольным да крытыкі і самакрытыкі; умець працаваць у калектыве; лагічна, аргументавана і ясна выказвацца вусна і пісьмова, выкарыстоўваць навыкі публічнага маўлення, вядзення дыскусіі і палемікі. Як бачна з прыведзенага пераліку, вялікае значэнне для фарміравання асобы педагога мае здольнасць да сацыяльнага ўзаемадзеяння, вядзення дыялогу і крытычнага аналізу ўласных учынкаў і паводзін іншых людзей. Веданне культурнай спадчыны, грамадзянскасць, упэўненасць у сабе і здольнасць да самаўдасканалення (якое можа быць не звязана з прафесійнай дзейнасцю) застаецца па-за ўвагай. Аднак усе гэтыя асобасныя характарыстыкі з'яўляюцца важнымі для педагога як для выкладання прадмета, так і для ўплыву на навучэнца, для рэалізацыі выхаваўчага ўздзеяння, якое мае выключнае значэнне ў адукацыйным працэсе. Сведчаннем гэтаму з'яўляецца і народная мудрасць, у якой гаворыцца, што выхаваць «крылатага» могуць толькі «крылатыя» педагогі і бацькі, выхаваць шчаслівага можа толькі шчаслівы, а сучаснага – толькі сучасны чалавек.

Сфарміраваныя асобасныя кампетэнцыі істотна ўплываюць на працэс сацыялізацыі і самаактуалізацыі актыўнага грамадзяніна (якім павінен быць педагог) і дазваляюць студэнту: лепш разумець сябе, усведамляць свае матывы; паляпшаць уяўленні аб сабе, адчуваць упэўненасць у сваіх сілах; знаходзіць раўнавагу паміж асабістымі мэтамі і практычнай дзейнасцю ў іх рэалізацыі; пазбаўляцца ад унутраных канфліктаў, умела кантраляваць эмоцыі і паводзіны; пераадольваць шаблоны і стэрэатыпы мыслення; бачыць больш выбару ў розных сітуацыях.

**Асноўная частка.** Працэс набыцця студэнтамі педагагічных спецыяльнасцей асобасных кампетэнцый павінен засноўвацца на пашырэнні адукацыйнай прасторы, далучэнні да найлепшых набыткаў сусветнай і нацыянальнай культуры, што актыўна садзейнічаюць фарміраванню светапогляду будучага педагога, яго грамадзянскай пазіцыі, каштоўнасных адносін да гісторыі грамадства і свайго ўласнага жыцця. Уключэнне сродкаў музея (музейны прадмет, інфармацыя, экспазіцыя, асяроддзе) у арганізацыю працэсу выхавання і навучання адпавядае гэтай умове, таму што студэнты маюць магчымасць пашырыць свой кругагляд, атрымаць станоўчыя эмоцыі і эстэтычнае задавальненне ад успрымання прадметаў мастацтва.

Музей (ад грэч. μουσεῖον – храм музаў) як установа культуры ў сучасным соцыуме актыўна развіваецца і паспяхова рэалізуе свае функцыі па збіранні, вывучэнні, захоўванні і папулярызацыі грамадскіх і прыродных каштоўнасцей, выкарыстоўваючы актыўныя формы працы з наведвальнікамі, разнастайныя мультымедыйныя і інфармацыйныя тэхналогіі.

Адукацыйная дзейнасць музея як адна з функцый гэтай установы звязваецца ў першую чаргу з пашырэннем яе дзейнасці на педагагічны працэс. Яшчэ ў XIX ст., у перыяд буйнога росквіту музейнай справы, у Паўднёва-Кенсінгтонскім музеі (ЗША) было наладжана ўзаемадзеянне з настаўнікамі сярэдніх школ, мэтай якога было забеспячэнне сумеснай работы па навукова-тэхнічным і мастацкім выхаванні і навучанні. У пачатку XX ст. тэарэтызацыя адукацыйнай функцыі музея адным з першых была зроблена амерыканскім даследчыкам Д. Гудам, які мэту дзейнасці гэтай установы разглядаў як «навучанне ідэям праз прадметы». У выніку пашырэння ідэй музейнай адукацыі былі распрацаваны тыпы праграм для розных катэгорый наведвальнікаў (Д. Хайд): адпачынак і забавы; павышэнне ўзроўню ведаў (у тым ліку і студэнтаў-мастацтвазнаўцаў і мастакоў); у дапамогу знаўцам; для карысці дзецям. Прынцыповае адрозненне адукацыйнага працэсу ў музеі і ў школе заключалася ў прыярытэце непасрэднага знаёмства з музейным прадметам перад выкарыстаннем яго ў якасці сродку навучання па тым ці іншым прадмеце. У выпадку, калі справа датычылася помніка мастацтва, то педагог у музеі толькі стымуляваў назіранне за прадметам.

Зараджэнне музейнай педагогікі як галіны навуковых ведаў, што займаецца даследаваннем мэт і задач, прынцыпаў, зместу, метадаў і форм рэалізацыі адукацыйнай дзейнасці музея, арыентаванай на перадачу культурнага вопыту (С.Л. Траянская), звязваецца з імёнамі нямецкіх даследчыкаў (Г. Керштэнштэйнэр, А. Ліхтварк, Г. Фрайдэнталь і інш.), якімі ў 20–30-я гг. XX ст. былі распрацаваны прынцыпы адукацыйнай дзейнасці музея, патрабаванні да правядзення заняткаў у гэтай установе, уведзены паняцце «музейныя дыялогі» і «музейная педагогіка».

У сучасных расійскіх навуковых даследаваннях (Б.А. Сталяроў) адукацыйная дзейнасць музея разглядаецца ў трох аспектах: пазнавальным, творчым і сацыяльным [1, с. 40]. Першы з іх звязаны з засваеннем ведаў, якія носяць як тэарэтычны, так і практычны характар і з'яўляюцца вынікам пазнання рэальнасці. Гэтыя два тыпы ведаў выступаюць у якасці сэнсаў, што чалавек уносіць у сваё жыццё. Аднак, апрача тэарэтычнага і практычнага боку пазнавальнага працэсу, існуе яшчэ каштоўнасны, калі асоба ацэньвае веды з пазіцыі затрачанай працы на іх засваенне і магчымасці выкарыстання ў працэсе жыццядзейнасці. Менавіта ў музеі адукацыя ажыццяўляецца праз каштоўнасныя адносіны асобы да помніка культуры і пашырэнне пачуццёвага вопыту ў працэсе камунікацыі з ім.

[1] Ядченко, Е.М. Формирование личностных компетенций студентов в процессе реализации воспитательной системы технического ССУЗ : дис. ... канд. пед. наук : 13.00.08 / Е.М. Ядченко. – Томск, 2009. – 184 л.

Працэс пазнання ў гэтай установе цесным чынам звязаны са спасціжэннем вынікаў творчай дзейнасці чалавека, таму што менавіта ў працэсе творчасці асоба самавыражаецца, раскрывае свой прыродны патэнцыял да пераўтварэння і пераўвасаблення навакольных рэалій. У музеі ствараюцца асаблівыя ўмовы для творчага працэсу за кошт «пагружэння» наведвальніка ў сістэму найлепшых узораў, традыцый, прыкладаў культуры мінулага.

Разам з гэтым любая музейная ўстанова з'яўляецца крыніцай сацыялізацыі для наведвальніка. За кошт інфармацыйнага, зрокавага ўспрымання і эмацыянальнага перажывання ў асобы пашыраецца светабачанне, фарміруецца светапогляд. На аснове далучэння студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей да культурных набыткаў соцыуму, пры засваенні традыцый і нацыянальных каштоўнасцей фарміруецца актыўная пазіцыя ў дачыненні да грамадскай дзейнасці.

Аналіз аспектаў адукацыйнай дзейнасці «храма музаў» і яго ролі ў выхаванні і развіцці асобы дазваляе зрабіць выснову аб актуальнасці і неабходнасці выкарыстання сродкаў музея ў падрыхтоўцы будучых педагогаў, у фарміраванні іх асобасных кампетэнцый (малюнак).




**Малюнак. – Роля адукацыйнай дзейнасці музея
ў фарміраванні асобасных кампетэнцый будучых педагогаў**

Як бачым на малюнку, адукацыйная дзейнасць музея за кошт рэалізацыі пазнавальнага, творчага і сацыяльнага аспекту аказвае комплекснае ўздзеянне на асобу будучага педагога (інфармацыйнае, эмацыянальнае, эстэтычнае), якое закранае яго сферу інтарэсаў і каштоўнасцей і садзейнічае фарміраванню асобасных кампетэнцый.

Нягледзячы на тое, што на сучасным этапе функцыянавання і развіцця сістэмы адукацыі ў Беларусі выкарыстанне сродкаў музейнай педагогікі з'яўляецца прыярытэтным напрамкам у выхаванні грамадзянскасці і патрыятызму ў навучэнцаў, вызначаны формы такой працы ў «Праграме неперарыўнага выхавання дзяцей і навучэнскай моладзі» (тэматычныя выставы, урокі мужнасці, лекцыі, семінары, адукацыйныя праекты і інш.), аднак сістэмнага падыходу да выкарыстання адукацыйнай дзейнасці музея ў падрыхтоўцы педагагічных кадраў, якія павінны выкарыстоўваць сродкі музея ў выхаванні моладзі, не назіраецца.

На сучасным этапе развіццё музейнай педагогікі як навуковай дысцыпліны, напрыклад, у Расійскай Федэрацыі скіравана ў першую чаргу на рашэнне задач актывізацыі творчых здольнасцей асобы. З гэтай мэтай распрацоўваюцца разнастайныя метады і формы работы з наведвальнікамі, якія мяняюць іх ролю і пазіцыю

ў музейна-педагагічным працэсе. Асноўная ўвага методыкі педагагічнага супрацоўніцтва музея і навучальных устаноў па-ранейшаму сканцэнтравана на дзіцячай і юнацкай аўдыторыі. Вядучай тэндэнцыяй у гэтай сферы дзейнасці становіцца пераход ад адзінкавых і эпізадычных кантактаў з наведвальнікамі да стварэння шматступеннай сістэмы музейнай адукацыі, далучэння навучэнцаў да грамадскіх каштоўнасцей, таксама фарміраванне музейнай культуры.

Многія сучасныя расійскія даследчыкі ў галіне музейнай педагогікі (М.В. Нагорскі, Б.А. Сталяроў, М.Ю. Юхневіч і інш.) выкарыстоўваюць вопыт сваіх папярэднікаў (А.В. Бакушынскі, М.В. Наварускі, Б.Я. Райкоў і інш.) і напрацоўкі нямецкіх калег у гэтай справе. У 1984 г. пры Навукова-даследчым інстытуце культуры створаны Усерасійскі семінар «Музей і пакаленне, якое падрастае». На пасяджэннях музейных педагогаў закранаюцца праблемы ўзаемасувязі музея і ўстаноў адукацыі, метады іх працы, вядзецца дзейнасць па стварэнні сістэмы заняткаў, якія ўключаюць новыя методыкі, прыёмы, што актывізуюць творчы патэнцыял наведвальнікаў, фарміруюць сістэму іх каштоўнасцей. Існуе таксама вопыт стварэння творчых лабараторый, а таксама буйных музейна-педагагагічных цэнтраў, адзін з якіх знаходзіцца ў Пецярбургу (кіраўнік – Б.А. Сталяроў).

Некаторыя даследчыкі кажуць аб неабходнасці раздзялення культурна-асветніцкай функцыі музея і педагагічнай (М.Ю. Юхневіч), якая арыентавана непасрэдна на наведвальніка і звязана са зменай парадыгмы адукацыі. Разам з тым паняцце адукацыі трактуецца вельмі шырока і звязана з развіццём асобы, фарміраваннем яе інтэлекту і каштоўнаснай сферы, працэсам знаходжання чалавекам свайго ўласнага «я».

Беларускія вучоныя ў сваіх даследаваннях звяртаюцца да выкарыстання сродкаў музея ў выхаванні школьнікаў, да метадычнай арганізацыі заняткаў на базе гэтай установы (В.М. Варановіч, І.Г. Лупашка, В.У. Міронччык і інш.). Пры гэтым акцэнт у большасці даследаванняў ставіцца на рэалізацыю асветніцкай функцыі музеяў, распрацоўку новых форм працы са школьнікамі, раскрываецца роля «храма музаў» у справе патрыятычнага выхавання моладзі. Нягледзячы на тое, што пасада музейнага педагога не ўведзена ў гэтых установах культуры ў Рэспубліцы Беларусь, музейна-педагагічная дзейнасць ажыццяўляецца ў кожнай з іх у межах супрацоўніцтва са школамі або з дашкольнымі ўстановамі адукацыі. Практыка ўзаемадзеяння з установамі вышэйшай адукацыі часцей за ўсё абмяжоўваецца правядзеннем аглядных або тэматычных экскурсій, якія выкарыстоўваюцца для рэалізацыі выхаваўчых задач і часта не адаптаваны да наведвальнікаў, якія атрымліваюць пэўную прафесію, у тым ліку і педагагічную.

Таму, на наш погляд, мэтавае выкарыстанне адукацыйнай дзейнасці музея ў прафесійнай падрыхтоўцы будучага педагога з'яўляецца надзвычай актуальным, бо ў многім ад яго асобасных характарыстык залежыць эфектыўнасць выхаваўчага ўздзеяння на новае пакаленне, ад стваральнай дзейнасці якога залежыць развіццё грамадства.

Тэарэтычныя асновы фарміравання асобасных кампетэнцый будучых педагогаў сродкамі адукацыйнай дзейнасці музеяў прадстаўлены метадалагічнымі падыходамі (аксіялагічным, культуралагічным, асобасна арыентаваным, сістэмным, кампетэнтнасным), якія забяспечваюць стратэгічную накіраванасць працэсу выхавання і навучання ў структурным, функцыянальным, інфармацыйным аспекце з апорай на ўласцівае для іх канкрэтна-навуковае і філасофскае пазнанне.

У нашым выпадку метадалогія даследавання выяўляецца з пазіцыі поліпарадыгмальнасці, якая заключаецца ў несупярэчлівасці ўзаемадзеяння і ўзаемадапаўненні ідэй аксіялагічнага, культуралагічнага, асобасна арыентаванага, сістэмнага, кампетэнтнаснага падыходаў, дзе дамінантай з'яўляецца арыентацыя на асобу як суб'екта дзейнасці ў адукацыйным працэсе. Менавіта ў суб'ектывацыі пазіцыі навучэнца пры ажыццяўленні ім пазнавальнай дзейнасці і заключаецца сутнасць гуманізацыі як адной з асноўных тэндэнцый развіцця сістэмы адукацыі ў свеце.

У сувязі з тым, што асноўнай мэтай грамадскага развіцця становіцца чалавек, яго здольнасці і творчая рэалізацыя, асаблівую важнасць у падрыхтоўцы педагогаў набывае аксіялагічны падыход, накіраваны на фарміраванне каштоўнасцей, якія з'яўляюцца часткай светапогляду асобы.

Каштоўнасць як катэгорыя абумоўлівае прыняцце рашэння асобай, звязанае з яе патрэбамі і індывідуальнымі прыярытэтамі. Да асноўных прынцыпаў аксіялагічнага падыходу адносяцца: раўнапраўе ўсіх філасофскіх поглядаў у межах адной гуманістычнай сістэмы каштоўнасцей (пры захаванні разнастайнасці культурных і этнічных асаблівасцей); раўназначнасць традыцый і творчасці, прызнанне неабходнасці вывучэння і выкарыстання навуковых ведаў мінулага і магчымасцей адкрыцця ў сучаснасці і будучым; роўнасць людзей, прагматызм замест спрэчак пра асноўныя каштоўнасці; дыялог замест абыякавасці або адмаўлення адзін другога. Гэтыя палажэнні акрэсліваюць важнасць суб'ектнасці навучэнца, рэалізацыі яго творчага патэнцыялу, апоры на культурны сацыяльны вопыт, дыялагічнасці ў арганізацыі адукацыйнага працэсу. Некаторыя даследчыкі (Я.У. Якаўлева, Н.А. Якаўлева) адзначаюць, што іерархія каштоўнасцей асобы вызначае прыярытэты ў яе дзейнасці, што праяўляецца ў ідэалах, перакананнях, установках [2, с. 87–90].

Спалучэнне прынцыпаў аксіялагічнага і культуралагічнага падыходаў (культураадпаведнасць, прадуктыўнасць, мульцікультурнасць, гарманізацыя рацыянальнага і эмацыйнага фактараў) з'яўляецца, на наш погляд, відавочным, бо ў іх аснове ляжыць стаўленне да чалавека як суб'екта культуры, а розныя аспекты яго быцця (свядомасць, творчасць, духоўнасць) разглядаюцца ў іерархічнай залежнасці, як неад'емныя атрыбуты цэласнасці асобы. І тут ужо заканамерная сувязь з асобасна арыентаваным падыходам, у межах якога асаблівая ўвага надаецца індывідуальнасці навучэнца (яго непаўторнасці і ўнікальнасці), пры тым што асобай можна назваць толькі таго чалавека, які ўключаны ў сістэму грамадскіх адносін, становіцца арганічнай часткай соцыуму [3, с. 66]. Адсюль

і прыярытэтныя прынцыпы выхавання і навучання: суб'ектнасць, усвядомлены выбар і самарэалізацыя асобы ў грамадстве, якія звязаны з названымі вышэй прынцыпамі аксіялагічнага і культуралагічнага падыходаў.

Сістэмны падыход (вядучыя прынцыпы: структурнасць, цэласнасць, іерархічнасць, узаемазалежнасць знешніх і ўнутраных фактараў) аб'ядноўвае вышэй акрэсленыя метадалагічныя ідэі (палажэнні) на агульнанавуковым узроўні, актуалізуючы важнасць індывідуальнай адукацыйнай траекторыі навучэнца для яго паспяховай сацыялізацыі.

Кампетэнтнасны падыход з яго прынцыпамі рэалізацыі (развіццё творчага патэнцыялу асобы, прафесійная мабільнасць і накіраванасць, модульнасць, мадэляванне прафесійнай дзейнасці), якія на сучасным этапе развіцця сусветнай сістэмы адукацыі з'яўляецца вядучым, не супярэчыць логіцы прыведзенай парыдагмальнасці навуковага даследавання, што абумоўлена як укараненнем сучасных інавацыйных педагагічных практык, так і неабходнасцю захавання традыцый у структуры і функцыях сістэмы адукацыі.

І.А. Зімняя ўказвае наступныя сутнасныя характарыстыкі кампетэнтнасці, якія раскрываюць перавагі гэтай метадалагічнай асновы ў параўнанні з традыцыйным (ведавым) падыходам: кампетэнтнасць шырэй за веды і ўменні; кампетэнтнасць уключае эмацыйна-валявую рэгуляцыю паводзінавых праяўленняў; валоданне ёю мае значэнне для суб'екта; з'яўляецца актыўнай праявай чалавека ў яго дзейнасці і паводзінах і характарызуецца мабілізацыйнай гатоўнасцю да яе рэалізацыі ў любой сітуацыі [4, с. 15].

Гэты ж даследчык, акцэнтуючы ўвагу на інтэгральнасці прыроды кампетэнцый як псіхалагічнага новаўтварэння (веды, уяўленні, алгарытмы дзеянняў, сістэмы каштоўнасцей і адносін), выдзяляе ў асобную групу тыя, якія адносяцца да самога чалавека як асобы, суб'екта дзейнасці, зносін (адначасова з кампетэнцыямі асобы ў сферы сацыяльнага ўзаемадзеяння і дзейнасці). Гэта кампетэнцыі здароўязберажэння, каштоўнасна-сэнсавай арыентацыі ў Свеце, інтэграцыі, грамадзянскасці і самаўдасканалення, самарэгулявання, самаразвіцця, асобаснай і прадметнай рэфлексіі [5, с. 15].

Пастаноўка асобы ў цэнтр адукацыйнага працэсу, які ажыццяўляецца ў музеі, і пагружэнне навучэнца ў свет культурных каштоўнасцей за кошт цэласнага (трохаспектнага) музейнага ўздзеяння з'яўляецца важным крокам на шляху да мадэрнізацыі прафесійнай падрыхтоўкі педагогаў, паколькі дазваляе эфектыўна рэалізоўваць прынцып поліпарадыгмальнасці (спалучэнне розных метадалагічных падыходаў). М.В. Нагорскі сцвярджае, што ў працэсе музейна-педагагічнай дзейнасці вектар уздзеяння на асобу прынцыпова іншы, «ён ідзе не ад грамадства, як у працэсе сацыялізацыі, не ад прафесіі, воінскіх функцый або патрабаванняў пэўнага віду спорту, а ад асобы, яе інтарэсаў і патрэб, здольнасцей і талентаў» [6].

Супрацоўнік музея, арганізуючы сустрэчу навучэнцаў з помнікамі культуры, ажыццяўляе «мастацка-педагагічны» акт, пры якім улічваецца як матывацыя наведвальнікаў на засваенне зместу, так і апора на ўласны жыццёвы вопыт і яго пашырэнне. Выхаваўчы патэнцыял музейнага асяроддзя, якое з'яўляецца адлюстраваннем культуры грамадства, характарызуецца наступнымі прыкметамі: інфармацыйнай і знакава-сімвалічнай насычанасцю, эмацыйна-каштоўнаснай узбагачанасцю, прадметна-творчай прасторай для развіцця асобы. Важнымі прынцыпамі эфектыўнай музейна-педагагічнай дзейнасці ў сучасных умовах (А.М. Краснова) з'яўляюцца: інтэграцыя адукацыйнага і музейнага кантэкстаў, дыялогавасць, крэатыўнасць, індывідуальна-асобасная накіраванасць у змесце работы.

**Заключэнне.** Такім чынам, адукацыйная дзейнасць музея з яе трохаспектным уздзеяннем на асобу наведвальніка ўплывае на працэс прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў педагагічных спецыяльнасцей: веды набываюць практычную скіраванасць, дзякуючы гістарычнай аснове і візуалізацыі, ажыццяўляецца сацыялізацыя асобы і ствараюцца ўмовы для творчасці. Фарміраванне асобасных кампетэнцый будучых педагогаў (каштоўнасна-сэнсавых, грамадзянска-патрыятычных, культуралагічных, здароўезберагальных, асобасна-развіццёвых) сродкамі музея ажыццяўляецца на аснове аксіялагічнага, культуралагічнага, асобасна арыентаванага, сістэмнага і кампетэнтнаснага падыходаў. Авалоданне будучымі спецыялістамі ў галіне адукацыі асобаснымі кампетэнцыямі забяспечвае іх гуманістычную накіраванасць пры камунікацыі і ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі, пры пабудове сваёй асабістай жыццёвай і адукацыйнай траекторыі, самаактуалізацыі ў грамадстве, абумоўлівае паважлівае стаўленне да традыцый і культуры свайго народа, уплывае на агульную культуру ў паводзінах і зносінах.

ЛІТАРАТУРА


1. Столяров, Б.А. Музейная педагогика. История, теория, практика : учеб. пособие / Б.А. Столяров. – М. : Высш. шк., 2004. – 216 с.
2. Яковлев, Е.В. Аксиологический подход в педагогическом исследовании: сущность, значение, проблемы реализации [Электронный ресурс] / Е.В. Яковлев, Н.О. Яковлева // Соврем. высш. шк.: инновац. аспект. – 2010. – № 3. – С. 85–92. – Режим доступа: https://www.elibrary.ru/download/elibrary_15628981_40199715.pdf. – Дата доступа: 31.01.2021.
3. Смирнов, С.Д. Педагогика и психология высшего образования: от деятельности к личности : учеб. пособие / С.Д. Смирнов. – М. : Академия, 2001. – 304 с.
4. Зимняя, И.А. Общая культура и социально–профессиональная компетентность человека / И.А. Зимняя // Высш. образование сегодня. – 2005. – № 11. – С. 14–20.
5. Зимняя, И.А. Ключевые компетентности как результативно-целевая основа компетентностного подхода в образовании / И.А. Зимняя. – М. : ИЦПКПС, 2004. – 42 с.

6. Нагорский, Н.В. Музейная педагогика и музейно-педагогическое пространство [Электронный ресурс] / Н.В. Нагорский // LIBRARY.BY. – Режим доступа: https://library.by/portalus/modules/shkola/readme.php?subaction=showfull&id=1193749079&archive=1194448667&start_from=&ucat=&. – Дата доступа: 17.10.2019.

REFERENCES

1. Stoliarov, B.A. (2004). *Muzeinaia pedagogika. Istoriia, teoriia, praktika* [*Museum pedagogy. History, theory, practice*]. Moskow: Higher school. (In Russ.).
2. Iakovlev, E.V. & Yakovleva, N.O. (2010). Aksiologicheskii podkhod v pedagogicheskom issledovanii: sushchnost', znachenie, problemy realizatsii [Axiological approach in pedagogical research: essence, meaning, problems of implementation]. *Sovremennaia vysshaia shkola: innovatsionnyi aspekt* [*Modern higher school: an innovative aspect*], (3), 85–92. (In Russ.). https://www.elibrary.ru/download/elibrary_15628981_40199715.pdf
3. Smirnov, S.D. (2004). *Pedagogika i psikhologiia vysshego obrazovaniia: ot deiatel'nosti k lichnosti* [*Pedagogy and Psychology of higher education: from activity to personality*]. Moscow: Akademiya. (In Russ.).
4. Zimniaia, I.A. (2005). Obshchaia kul'tura i sotsial'no-professional'naia kompetentnost' cheloveka [General culture and socio-professional competence of a person]. *Vysshee obrazovanie segodnia* [*Higher education today*], (11), 14–20. (In Russ.).
5. Zimniaia, I.A. (2004). *Kliuchevye kompetentnosti kak rezul'tativno-tselevaia osnova kompetentnostnogo podkhoda v obrazovanii* [*Key competencies as a result-target basis of the competency-based approach in education*]. Moscow: ICCPCC. (In Russ.).
6. Nagorskii, N.V. *Muzeinaia pedagogika i muzeino-pedagogicheskoe prostranstvo* [*Museum Pedagogy and Museum-Pedagogical Space*]. (In Russ.). https://library.by/portalus/modules/shkola/readme.php?subaction=showfull&id=1193749079&archive=1194448667&start_from=&ucat=&

*Паступіў 12.05.2022*

**THEORETICAL AND METHODOLOGICAL FUNDAMENTALS OF FORMATION OF PERSONAL COMPETENCES OF FUTURE TEACHERS BY FUNDS OF EDUCATIONAL ACTIVITIES OF THE MUSEUM**

***S. GRINKO***

*The article covers the problem of training highly qualified teachers. One of the ways to solve it is to use the museum's educational activities in the training of future teachers, which ensures the formation of their personal competencies (values, values, civic and patriotic, cultural, health, personal and developmental), which are the basis of citizenship, patriotism orientation, as well as the ability to self-education and self-development required in modern society. The methodological bases of using the museum's funds in the education and training of students of pedagogical specialties are revealed: approaches (axiological, cultural, personality-oriented, systemic, competence) and principles of their implementation.*

***Keywords:*** *future teachers, educational activities of the museum, personal competencies, methodological approaches, principles of implementation.*